# РАБІЎ МАЙСТАР КЛІМ МІХАЙЛАЎ

**Выпускніца гістарычнага факультэта Л. Міхайлоўская — пераможца рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх навуковых работ.**

**Спадзяёмся, нашым чытачам будзе цікава пазнаёміцца з яе даследаваннямі.**

Масква пачатку XVII ст., абвешчаная «трэцім Рымам», узмоцнена будавалася і таму адчувала вострую патрэбу ў майстрах-рамесніках.

Не знаходзячы работы ў эканамічна застойнай Рэчы Паспалітай, беларускія рамеснікі ахвотна згаджаліся на перасяленне. Маскоўскі ўрад даваў ім розныя льготы, а таксама грошы на дарогу; да таго ж рускія былі для беларусаў людзьмі адной праваслаўнай веры. І па ўзаемнай згодзе з маскоўскімі баярамі беларускія майстры пакідалі родныя мясціны і з сем'ямі здымаліся ў дарогу, у далёкую Маскву.

Так апынуўся ў Маскве шклоўскі разбяр па дрэве Клім Міхайлаў. Нягледзячы на тое, што маскоўскі ўрад усяляк заахвочваў каменнае будаўніцтва і абяцаў «царскія міласці» таму, хто пабудуе каменныя палаты, пераважалі драўляныя будынкі — дрэва было таннейшае за камень. Усе будынкі таго часу мелі шмат сашчапенняў, сувязяў і тарцовых частак, якія трэба было прыкрываць альбо цёсам, альбо выразанымі ліштвамі. Аздоба маскіравала ўсе асноўныя архітэктурныя лініі будынкаў: франтоны дахаў, верхнія вянкі зруба і тарцы бярвенняў. Разьбой аздаблялася ліштва вокан, ганкі, сенцы, вароты, а таксама калодзежы, свірны, капліцы. Багата ўпрыгожваліся разьбой і «ўстаўні» вокан.

Знаёмячыся з маскоўскім жыццём, Клім Міхайлаў уцягваўся ў яго распарадак.

*(Заканчэнне на 4-й стар.).*



Ва універсітэце стала традыцыяй праводзіць сустрэчы першакурснікаў з вядучымі выкладчыкамі. Нядаўна такая сустрэча адбылася і на гістарычным факультэце. Перад студэнтамі-навічкамі выступіў член-карэспандэнт Акадэміі педагагічных навук СССР прафесар Л. С. Абецэдарскі. Ён расказаў, як лепш рыхтавацца да лекцый і практычных заняткаў, як працаваць над падручнікамі, дапаможнікамі, творамі класікаў марксізму-ленінізму, як берагчы час.

НА ЗДЫМКУ: выступае Л. С. Абецэдарскі.

Фота **Д. Чаховіча.**

# ЧАС НЯЛЁГКІ,

*Рэдкалегія насценгазеты біяфака «Віта», рыхтуючыся да юбілею універсітэта, наладзіла перапіску з былымі выпускнікамі факультэта.*

*Сёння з дазволу вітаўцаў мы прапануем чытачам успаміны заслужанага настаўніка РСФСР М. А. Бутырскага, які быў студэнтам БДУ ў першыя гады яго існавання.*

**1922 год. Яшчэ не так даўно адгрымелі выбухі грамадзянскай вайны. Жыццё ў Краіне Саветаў стала наладжвацца. Група школьнікаў, атрымаўшая сярэднюю адукацыю ў горадзе Старадубе Гомельскай вобласці, робіць спробу вучыцца далей. Пішуцца заявы ў розныя ВНУ краіны: у Маскву, Ленінград, Кіеў, і амаль усюды на іх рэзалюцыі: Мінскі універсітэт. Даведваемся, што універсітэт адкрыт толькі год таму назад, і, вядома, аб ім пакуль мала хто ведае.**

**І вось у сярэдзіне жніўня мы ўжо ў Мінску. Знаёмімся з горадам, падаем заявы ва універсітэт. Многія з нас думалі паступаць на медыцынскі факультэт, але, спалохаўшыся вялікага конкурсу, падалі заявы на прыродазнаўчае аддзяленне педагагічнага факультэта. Пачаліся напружаныя перадэкзаменацыйныя дні. Нарэшце, калі мяне не падводзіць памяць, у самым канцы жніўня для нас быў наладжан экзамен па гісторыі. У мяне прымаў яго прафесар Перцаў і паставіў станоўчую адзнаку. Станоўчыя адзнакі атрымалі і ўсе мае таварышы. Вынікаў прыёму трэба было чакаць доўга, і мы ўсе раз'ехаліся па дамах, дамовіўшыся аб тым, што аб выніках нам паведамяць.**

**У самым пачатку кастрычніка прыйшла тэлеграма, у якой гаварылася, што ўсе мы — а нас, трымаўшых экзамен на прыродазнаўчае аддзяленне, было чацвёра — залічаны і што заняткі пачаліся. Зборы былі кароткімі, і праз два-тры дні мы былі ўжо за студэнцкім сталом.**

Некалькі слоў аб быце. Усе мы размясціліся на прыватных кватэрах у раёне Віленскага вакзала. Наша кватэрная гаспадыня была вельмі добрая жанчына, заўсёды гатовая дапамагчы не толькі мне, але і маім таварышам. Жылі мы больш чым скромна. Калі вычэрпваліся запасы, узятыя з дому, было проста галадна. Не заўсёды маглі паабедаць, часта даводзілася абмяжоўвацца адной першай стравай, а то і яе не было. Студэнцкая сталовая не магла задаволіць усіх, маючых у ёй патрэбу. Вядома, так жылі не ўсе. Мясцовыя студэнты, у якіх былі бацькі, адчувалі сябе значна лепш.

Пазней, на III—IV курсах, у нас паявіліся заработкі ў выглядзе прыватных урокаў. Даводзілася даваць іх у розных кутках горада і на працягу дня пераадольваць вялікія адлегласці. Мы рыхтавалі па розных прадметах жадаючых паступіць ва універсітэт. І небяспасяхова.

Каб набыць неабходнае адзенне і абутак, асабліва ўзмоцнена працавалі летам, адказваючы сабе ў паездцы на канікулы дадому. Не ігнаравалі і іншыя віды заробку: капалі ямы для пасадкі дрэў, разносілі газеты, працавалі на зернесушцы і г. д.

Я часта супастаўляю свой студэнцкі быт у тыя далёкія гады са студэнцкім бытам маіх двух сыноў, якія закончылі ВНУ Масквы і працуюць цяпер адзін урачом, другі інжынерам. Яны заўсёды былі сытыя, добра апранутыя.

Але імкненне да вучобы было настолькі вялікім, што ўсе цяжкасці аказаліся пераадоленымі, і цяпер аб гэтым часе застаўся нейкі цёплы ўспамін як аб гадах цяжкіх, але цудоўных.

* * *

Універсітэт размяшчаўся ў двух будынках. У вялікім будынку на Універсітэцкай вуліцы чыталіся лекцыі па гуманітарных прадметах, а ў памяшканні былога епархіяльнага вучылішча на Шырокай вуліцы размяшчаліся аўдыторыі, лабараторыі, кабінеты па хіміі, заалогіі, батаніцы і геалагічных дысцыплінах. Цяжка было меркаваць аб тым, наколькі абсталяванне вучэбных памяшканняў задавальняла патрабаванні універсітэцкай вучобы, таму што ніхто з нас не ведаў, як пастаўлена выкладанне ў іншых вышэйшых навучальных установах. Адно магу сказаць: мы ўсе з вялікім энтузіязмам прыняліся за працу. Жывучы ў другім канцы горада і не маючы сродкаў для пераезду на конны (тады ў Мінску былі конкі), мы штодня рабілі маршруты пяшком у 4—5 кіламетраў, каб трапіць на лекцыю або практычныя заняткі. А бывалі выпадкі, калі такое падарожжа, не шкадуючы абутку, мы рабілі не адзін раз у дзень. Гэтыя маршруты не толькі не стамлялі нас, але, наадварот, надавалі нам бадзёрасці і, несумненна, станоўча ўплывалі на наша здароўе. Тады не патрабавалі даведкі аб прычынах непа-

Вярнуліся з сельскагаспадарчых работ студэнты другіх, трэціх, чацвёртых курсаў, і цясней стала ў лабараторыях і кабінетах, у чытальных залах. А пра бібліятэку і гаварыць нечага: чарга тут з ранку да вечара. Усе стараюцца хутчэй запасціся падручнікамі, дапаможнай літаратурай. Час вучобы патрабуе настойлівай працы.

**На здымку:** студэнткі IV курса хімічнага факультэта Аляксандра **Антонік** і Таіса **Кавалеўская** на лабараторных занятках па арганічнаму аналізу.

Фота Д. **Чаховіча.**



# ПРАЗ

Студэнцкі лёс Марыі Барсток і Веры Палтаран настолькі падобны, што зручней за ўсё весці гаворку пра іх жыццёвы і творчы шлях у адным артыкуле.

Барсток і Палтаран сустрэліся яшчэ ў канцы 30-х гадоў у Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага. Сяброўства студэнтак было такім шчырым і прыязным, што дзяўчаты толькі і марылі аб тым, каб пасля размеркавання ім дазволілі выкладаць у адной школе.

Але вайна перапыніла вучобу. Жыхары Мінска, пакідаючы наседжаныя месцы, ішлі на ўсход. Марыя Барсток і Вера Палтаран былі разам. Лёс закінуў іх ажно ў Паволжа. Прытулак быў знойдзен у мястэчку Барміно-Вянец, у 120 кіламетрах ад Горкага. Там дзяўчаты працавалі на мясцовым заводзе. Так прайшлі два цяжкія ваенныя гады.

Рэхам з роднай старонкі стала аб'ява ў «Правде», якая паведамляла аб аднаўленні работы Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Ваганняў у дзяўчат не было — трэба пасылаць заявы. Праз два тыдні прыйшоў, нарэшце, доўгачаканы адказ, у якім паведамлялася, што Барсток М. М. і Палтаран В. С. залічаны студэнткамі універсітэта. У канверце таксама ляжалі два пропускі ў Маскву.

Пачаліся зборы ў дарогу. Суседзі далі дзяўчатам перад ад'ездам трохі сухароў і сахарыну — вялікі шлях ляжаў наперадзе.

Выязджалі, калі на двары была глыбокая восень. Няспынна ішлі дажджы. Народу ў цяплушках ехала столькі, што дзяўчатам прыходзілася ў вагоне стаяць літаральна на адной назе. Частыя стаянкі рабілі дарогу бясконца доўгай. Недзе пад Каўровым у дзяўчат укралі сухары, і гэта было сапраўдным няшчасцем. Але наперадзе — універсітэт, і адна толькі думка аб ім прымушала забыцца пра гэты холад, пра бясконцую дарогу, пра сухары...

На Сходню Барсток і Палтаран прыехалі, калі ўжо дрэвы былі ў інеі. Ды што дрэвы — сцены ў будынку універсітэта, і тыя аб'інелі. Са столі звісалі ледзяшы...

Першае, што кінулася ў вочы, — гэта стракатасць адзення студэнтаў: кажухі, шынялі, цюбецейкі, валёнкі, халаты... Па адным толькі выглядзе студэнтаў можна было вызначыць род іх заняткаў і мінулае месцазнаходжанне.

На пяты курс былі пададзены... дзве заявы — ад Марыі Барсток і Веры Палтаран. Стварыць курс з двух чалавек адміністрацыя палічыла нямэтазгодным, і студэнткі былі залічаны на чацвёрты курс, колькасць якога была крыху большай—набліжалася да дзесяці.

Зараз цяжка ўявіць той «сходненскі» універсітэт. Замест кафедры — паламаны стол, парту замяняў пень, а лаваю былі дошкі. Але якой дружнай сям'ёй жылі студэнты-сходненцы! Незабыўнымі ў іх памяці засталіся лекцыі ў халодных аўдыторыях, паездкі ў Хімкі па хлеб, лесанарыхтоўкі ў Фірсанаўцы, куды ездзілі яны разам з М. І. Жыркевічам і дзе на пероне — хто ў валенках, а хто ў лапцях— танцавалі, каб сагрэцца...

Інтэрнатам служылі летнія дачы, але зімою жыць у іх было немагчыма. Адзіным ратункам ад холаду былі пашытыя, відаць, з маскхалатаў ватнія коўдры.

Мастацтва, як кажуць, патрабуе ахвяр. І студэнты, каб купіць білет у Вялікі тэатр або ў МХАТ, нават згаджаліся прадаваць сваю порцыю хлеба, суцяшаючы сябе, што «не хлебам адзіным сыты чалавек». У тыя цяжкія гады тэатр, можа, як ніколі, быў патрэбны людзям. Да сустрэчы з ім рыхтаваліся з асаблівай стараннасцю: пазычалі ў сяброў пінжакі, сарочкі, галёшы...

3 ліпеня 1944 года быў днём, якога ўсе вельмі доўга чакалі: была вызвалена сталіца роднай рэспублікі— Мінск. Вестка аб гэтым ім-

# ...РАБІЎ МАЙСТАР КЛІМ МІХАЙЛАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).*

Ён жыў у баярына Куракіна «без крэпасці», быў вольны. У 1657 годзе Куракін аддаў Кліма Міхайлава «на час» патрыярху Нікану. Нікан у гэты час пачаў будаўніцтва сваёй рэзідэнцыі — Васкрасенскага манастыра на рацэ Істры. Ён збіраў лепшых майстроў розных спецыяльнасцей, а беларускія майстры ў Расіі XVII ст. цаніліся асабліва высока.

Клім Міхайлаў працаваў у патрыярха Нікана на будаўніцтве Васкрасенскага манастыра восем гадоў. Разам з ім працавала больш за трыццаць майстроў-беларусаў, яго таварышаў. Але сварка патрыярха з царом перапыніла будаўніцтва манастыра.

Маскоўскі ўрад сам адчуваў патрэбу ў рабочых руках, і ўсе майстры-беларусы былі пераведзены ў Маскву. Выязджаючы з манастыра, Клім Міхайлаў і яго зямляк Гарасім Акулаў прасілі цара даставіць у Маскву іх «сталярскую снасць», каб «было чым гасудараву справу рабіць».

У 1667 годзе цар пачаў будаваць сабе новы палац у сяле Каломенскім. З восені 1666 года па царскаму ўказу пачалі нарыхтоўваць лес і іншыя будаўнічыя матэрыялы для будучага палаца. Рыхтаваўся да працы і Клім Міхайлаў разам з майстрамі сталярных і разбярных спраў. Усю зіму 1667—68 гадоў яны вырэзвалі розныя драўляныя ўпрыгожанні і арнаменты для ўнутранага і знешняга аздаблення палаца. Клім Міхайлаў быў прызначаны памочнікам галоўнага майстра і кіраўніка работ старца Арсенія, які прыехаў у Маскву з Оршы.

На пабудове палаца ў Каломенскім працавалі Гарасім Акулаў, Якаў Іваноў, Давыд Паўлаў і іншыя беларускія майстры. Работы было многа, і часта ў дапамогу ім бралі вучняў, дзяцей, а таксама гарадскіх рамеснікаў-беларусаў. Узнікалі цэлыя арцелі, на чале якіх стаялі старасты.

У той жа час у заморскія краіны ішлі заказы на фарбу і пазалоту для ўпрыгожвання палаца. У маі 1669 г. заказаныя матэрыялы былі дастаўлены ў Маскву. Яшчэ два гады распісвалі, фарбавалі і залацілі яго. Нарэшце ў 1671 г. палац, які захапляў сучаснікаў бляскам фарбаў і золата, адмысловай разьбой, «дзіўнай хітрасцю, цудоўнай прыгажосцю», быў гатовы.

Ён стаяў на правым беразе Масквы-ракі, між чатырох садоў. Расфарбаваныя, зробленыя пад луску дахі харомаў з меднымі бліскучымі грабеньчыкамі, арлы на вежах, вітыя слупы, пазалота вокан, варот і ганкаў рабілі гэты палац-гарадок падобным на новенькую цацку. Гэта была вяршыня тагачаснай рускай драўлянай архітэктуры.

Харомы Каломенскага палаца былі багата ўпрыгожаны жывапісам на рэлігійныя тэмы. Але галоўнай дэкаратыўнай і мастацкай аздобай палаца была разьба і выразаныя ўпрыгожанні, выробленыя Клімам Міхайлавым і яго сябрамі — беларускімі майстрамі. Вітыя слупы, балясіны, выразаныя пазалочаныя рамы для вокан, дзверы і ліштвы з «грымзамі» (карнізамі) выдатна дапаўнялі ўнутранае ўбранне палаца, якое было не менш раскошнае, чым яго знешняе афармленне.

Своеасаблівым упрыгожаннем палаца былі печы. Іх клалі з паліхромавых кафляў, пакрытых каляровай глазурай; вырабам іх здаўна славіліся беларускія землі.

Жывапіс і разьба Каломенскага палаца, над якімі нямала папрацавалі беларускія майстры, адлюстравалі «шмат гісторый цудоўных: чатыры часткі свету, зодый (задыяк) нябесны, усе поры года і мноства кветак, жыва напісаных», — так пісаў Сімеон Полацкі, адзін з сучаснікаў і адзін з самых адукаваных людзей свайго часу.

Восьмы цуд свету — Каломенскі палац — стаяў амаль 100 гадоў як сімвал самабытнага таленту майстроў, якія яго збудавалі.

У 1671 годзе, калі будаўніцтва Каломенскага палаца было закончана, усе майстры былі пераведзены ў Маскву, у Аружэйную палату.

Маскоўская Аружэйная палата была не толькі сховішчам зброі. У гэты час у Маскву перасялілася вялікая колькасць майстроў-беларусаў, у тым ліку і разбяроў. Усе яны траплялі ў распараджэнне Палаты разбярных і сталярных спраў. На чале ўсіх крамлёўскіх разбяроў быў пастаўлен старац Арсеній, які праславіўся сваім майстэрствам у Каломенскім. Клім Міхайлаў быў прызначан яму ў памочнікі, а ў 1681 г., пасля смерці старца, заняў яго месца.

Працы беларускім майстрам хапала. Разьбой аздаблялася драўляная мэбля, прасніцы, посуд, падсвечнікі. З дрэва вырэзваліся ўпрыгожанні, шахматы, цацкі. Акрамя таго, беларускія майстры выраблялі драўляныя формы для кафляў.

Ішоў час, удасканальвалася майстэрства Кліма Міхайлава. У 1683 г. ён атрымаў заказ на разьбу іканастаса для Смаленскага сабора Маскоўскага Навадзевічага манастыра — вельмі складаны і адказны. Гэтая праца стала вяршыняй творчасці Кліма Міхайлава.

Клім адабраў сабе 25 лепшых крамлёўскіх майстроў. Ім адвялі спецыяльнае месца для работы непадалёку ад манастырскага двара. Сюды ж былі дастаўлены ўсе матэрыялы і інструменты. Улетку працавалі пад адкрытым небам, а з набліжэннем восені ля Навадзевічага манастыра былі пабудаваны спецыяльныя майстэрні. Працавалі «паспешна і начамі». Але праца была скончана толькі праз тры гады.

Багацце і прыгажосць разьбы прыводзілі ў захапленне сучаснікаў — іканастас быў падобны на вялізную карункавую сцяну з золата. У гэтай працы выявілася бязмежная творчая фантазія Кліма Міхайлава і яго таварышаў, беларускіх разбяроў. Пры ўсёй разнастайнасці ўзору ў ім цяжка знайсці хоць бы адзін ліст, кветку або арнамент, які б паўтараў другі. Іканастас захаваўся да нашых дзён амаль у сваім першапачатковым выглядзе.

Пасля гэтай работы Клім Міхайлаў разам з іншымі беларускімі майстрамі зноў быў пераведзен у Крамлёўскія майстэрні. У канцы XVII ст. перад Рускай дзяржавай паўсталі новыя задачы, у сувязі з якімі перабудоўвалася ўся рамесная вытворчасць. Большасць старых майстроў Аружэйнай палаты была звольнена, а частка ўзята Пятром І у Архангельск і Варонеж для пабудовы флоту. Гэтым і быў пакладзен канец дзейнасці Маскоўскай Аружэйнай палаты.

**Л. МІХАЙЛОЎСКАЯ.**

# ШТО ТАКОЕ «СПОРТЛАТО»?

«Спортлато» — першая ў краіне спартыўна - лічбавая латарэя. «Спортлато» — гэта дзесяткі буйных, каштоўных сучасных збудаванняў. На сродкі «Спортлато» пабудавана рэкартанавая дарожка ў Лужніках (кошт 500 тыс. рублёў), санная траса ў Брацку (100 тыс.), грэбная база ў Мінгечатаўры. «Спортлато» — гэта вялікія сродкі, адпушчаныя на будаўніцтва спартыўнай залы ў горадзе Рапла Эстонскай ССР, на рэканструкцыю штучнай канькабежнай дарожкі ў Свярдлоўску (100 тыс. рублёў), на завяршэнне будаўніцтва Палаца спорту ў г. Адэсе; гэта 120 тысяч рублёў, зрасходаваныя на рэканструкцыю спортбудынкаў і баз для падрыхтоўкі алімпійскіх каманд. Камітэт па фізічнай культуры і спорту пры Савеце Міністраў СССР выдзеліў 275 тысяч рублёў для вядзення спартыўнага будаўніцтва ў Беларускай ССР.

Спартыўна - лічбавыя латарэі вельмі папулярныя ў ГДР, Польшчы, Чэхаславакіі і Балгарыі. У нашай краіне з вялікім поспехам праведзена 27 тыражоў «Спортлато». Мінск — чатырнаццаты горад, у якім адкрылася аддзяленне «Галоўспортлато». І ўжо многія мінчане будуць з нецярплівасцю чакаць вынікаў тыражу, які адбудзецца 10 кастрычніка.

Каб прыняць удзел у розыгрышы, трэба правільна запоўніць картачку.

Палавіна сродкаў ад продажу картачак ідзе на выйгрышы. Другая частка ідзе на будаўніцтва спортпляцовак, стадыёнаў, плавальных басейнаў, на далейшае развіццё нашага спорту.

**А. ЕЛІСЕЕЎ.**

# *«ЗВЯЗДА»—СТАРЭЙШАЯ ГАЗЕТА РЭСПУБЛІКІ*

**Квітнее тройчы ардэнаносная Беларусь. У брацкай сям'і народаў савецкіх яна набыла дзяржаўнасць, гонар і славу рэспублікі-воіна, рэспублікі-працаўніцы. І кожны з многіх тысяч дзён за ўсю гісторыю існавання Савецкай Беларусі адлюстраваны на старонках старэйшай беларускай газеты «ЗВЯЗДА».**

**«ЗВЯЗДА» пачала выходзіць у жніўні 1917 года, напярэдадні Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і з першага свайго нумара была верным баявым памочнікам Кампартыі і ўсяго беларускага народа на ўсіх этапах барацьбы за перамогу ідэй марксізму-ленінізму. Аб гэтым сведчаць высокія ўрадавыя ўзнагароды: ордэн Айчыннай вайны першай ступені, якім газета ўзнагароджана за вялікія заслугі ў мабілізацыі беларускага народа на барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, якім «ЗВЯЗДА» адзначана за плённую работу па камуністычнаму выхаванню працоўных Беларусі, мабілізацыі іх на выкананне задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва і ў сувязі з 50-годдзем з дня выхаду ў свет першага нумара.**

**І сёння «ЗВЯЗДА» на пярэднім краі ўсенароднай барацьбы за ажыццяўленне велічных планаў, распрацаваных XXIV з'ездам КПСС і XXVII з'ездам КПБ. Разнастайна і змястоўна паказвае яна партыйную, савецкую, прафсаюзную, гаспадарчую і культурную работу ў горадзе і вёсцы, палымяным словам прапагандуе ўсё новае і перадавое, змагаецца з недахопамі.**

**Вялікія планы газеты на будучае. У наступным, 1972 годзе ўся наша краіна адзначыць паўвекавы юбілей Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. «ЗВЯЗДА» будзе шырока знаёміць сваіх чытачоў з дасягненнямі брацкіх народаў СССР. Далейшае развіццё ў газеце знойдуць тэмы: «Вучыцца жыць і працаваць па-ленінску», «За высокую эфектыўнасць на кожным рабочым месцы», «Дабрабыт народа—у працы кожнага» і многія іншыя. Больш грунтоўна і цікава будуць асвятляцца пытанні міжнароднай і ўнутранай палітыкі, навукі і тэхнікі, літаратуры і мастацтва, аховы прыроды, фізкультуры і спорту. Для гэтай мэты ў рэдакцыі створаны спецыяльныя аддзелы, запрашаюцца высокакваліфікаваныя аўтары з ліку рабочых, калгаснікаў і інтэлігенцыі. Расшырыцца і набудзе новыя формы таксама работа з пісьмамі працоўных у газету.**

**Рабочы і калгаснік, інжынер і вучоны, партыйны і савецкі работнік—людзі ўсіх прафесій знойдуць на старонках «ЗВЯЗДЫ» адказы на самыя разнастайныя пытанні жыцця і працы.**

**НА ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ВЫПІСАЦЬ ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» НА 1972 ГОД!**

**Падпіска прымаецца без абмежавання ў гарадах і сельскай мясцовасці. Кошт падпіскі на год — 6 рублёў, на 6 месяцаў—3 рублі.**

# «ТВОРЧАСЦЬ» АБІТУРЫЕНТАЎ

⊙ *Юность никогда не плелась в хвосте.*

⊙ *Давыдов порвал нехорошую связь с Лушкой, но не порывал связи с народом.*

⊙ *Проза пісьменніка стала для мяне другой маткай.*

⊙ *Женщины жестоко избивают Семёна, но он и здесь держится на высоте.*

⊙ *Не доедая, не досыпая, они мечтали слушать шелест берез и бред ромашек.*

⊙ *Все свежие мысли давились.*

⊙ *Народ — вот решающая сила, движок истории.*

⊙ *В залу вошли графиня и ее графин.*

⊙ *Каждое произведение говорило о безразмерном таланте поэта.*

⊙ *В лесу чирикали воробьи и распевали собственным пением соловьи.*

⊙ *Половцев и народ были в перпендикулярных отношениях.*

⊙ *Восхищает оптимизм людей, которые верили в холод, голод и разруху.*

⊙ *Вся культура, красота человека должны просачиваться наружу.*

⊙ *В последней главе поэмы хорошо рисуется радостный поход советского гражданина по Москве.*

⊙ *В октябре многие деревья сидят голые.*

⊙ *Широка моя страна. На ее обширных краях живут люди.*

⊙ *Подвиг (наших современников) каждодневный, часто с бессонными ночами и без положенного отпуска.*





БЕЛАРУСЬ АЗЁРНАЯ.

Фотаэцюды Д. Чаховіча.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.

Т. 2000 экз. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. АТ 08425 Зак. 1168.